**Сярод нядаўніх лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі Беларусі — салістка нашага Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, заслужаная артыстка краіны, пераможца сямі міжнародных конкурсаў Аксана ВОЛКАВА. Яе спеўнае майстэрства даўно прызнанае не толькі ў нас, але і ў замежжы — ад Масквы да Лондана і Нью-Ёрка, куды яе пастаянна запрашаюць для ўдзелу ў асобных пастаноўках і фестывалях. З параўнанняў "тут і там", "у нас — у іх" і пачалася наша размова.**

Надзея БУНЦЭВІЧ


Аксана Волкава.

# Яна паўсюль!

## Аксана Волкава: сола і "ў ансамблі"

— Рознымі з'яўляюцца самі тыпы тэатраў. Наш тэатр адносіцца да так званых рэпертуарных, што распаўсюджаны, бадай, на ўсёй постсавецкай прасторы і ўтрымліваюць у афішы адначасова безліч спектакляў. На Захадзе існуе іншая схема: усе працуюць выключна на адну прэм'еру, ніхто паралельна не заняты іншым рэпертуарам. Другое прынцыповае адрозненне ў тым, што калі справа тычыцца нейкіх тэхнічных момантаў, працы тэхнічных службаў, там няма слова "нельга". Жывы агонь? Калі ласка. Найскладаныя канструкцыі на сцэне? Няма праблем. А ў нас на ўсе рэжысёрскія фантазіі ёсць іншы звыклы адказ: забаронена паводле тэхнікі бяспекі. Але я пастаянна сутыкаюся з парадоксам: усё тое, што ў нас "забаронена" — у замежных тэатрах чамусьці дазваляецца. Увогуле, адным з апошніх трэндаў у сусветнай сцэнаграфіі стала максімальнае ўжыванне не бутафорыі і муляжоў, а натуральных рэчаў: жывога агня, вады, пяску, зямлі, келіхаў, каб звінелі... Гэта сапраўды заваражвае. Калі ж нават замест свечкі, якую без аніякай рызыкі мы запальваем і ў храме і дома, выкарыстоўваецца электралямпачка, гэта адразу зніжае ўражанне ад відовішча.

**— А ўласна рэжысёрскія прыдумкі? Запытваю яшчэ і таму, што ўжо некалькі гадоў вы сумяшчаеце напружаны спеўны графік і сям'ю, дзе двое дзяцей, з заняткамі па класе опернай рэжысуры ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Дык як — набраліся ў замежжы "авангардызмаў"?**

— Нейкіх радыкальных пастановак у маёй выканальніцкай практыцы пакуль не было, а шкада. У той жа "Кармэн" мяне ніколі не прасілі зрабіць, да прыкладу, іншы характар, змяніць пластыку... Заўсёды адштурхоўваліся ад таго, што прапаноўваю ў маёй гера

больш, у вялізнай опернай зале, каб быць зразуметым не адно ў партэры, але і на балконе? Вырашаюць гэту праблему не ўсе пастаноўшчыкі, так што даводзіцца шукаць самастойна.

**— А калі рэжысёр не сочыць за далейшымі паказамі ці ён увогуле запрошаны і з'язджае пасля прэм'еры, дык салісты і ўвогуле змяняюць**

уласна вакальныя пытанні, з'яўляецца творчая свабода, пачынаецца сапраўднае "жыццё" твайго персанажа. Асабіста мне ў гэтым вельмі дапамагае партнёр: калі ёсць паміж намі нейкая іскра, дык і жэсты самі нараджаюцца, і ў каханне глядач паверыць, і ў нянавісць. Тут вельмі важна, каб абодва героі былі вельмі моцнымі асобамі, і ўсё ж яна яго

— Творчая асоба, якая будзе накіроўваць яго на правільны шлях. Спачатку гэта выкладчык — і мне вельмі пашанцавала, што я патрапіла ў клас Лідзіі Галушкінай, дзякуючы якой на выхадзе з Акадэміі музыкі ў мяне не было відавочных вакальных дэфектаў. А далей — праца з дырыжорам. Для мяне гэта быў Аляксандр Анісімаў, які ў той час працаваў у тэатры. На Захадзе вельмі распаўсюджаная сістэма майстар-класаў, але я лічу, што карыстацца гэтым трэба тады, калі ў цябе ўжо ёсць правільна сфарміраваная базавая ўстаноўка, на якую, бы на ёлку навагоднюю, ты можаш вешаць любыя ўпрыгажванні.

**— А конкурсы?**

— Мне заўсёды было ўсяго мала, хацелася большага. І муж увесь час стымуляваў: вось, ты нічога не робіш, на конкурсах нічога не атрымліваеш. Я нічога не атрымліваю? І панеслася... Разоў шэсць быў "лядзяны душ", але хутка я пачала разумець, што акрамя голасу вельмі цэніцца тое, як ты ім умееш валодаць, як абіраеш праграму. Гэта таксама неацэнны вопыт! Я вельмі ўдзячная, што мне дапамагалі і старэйшыя калегі (той жа Уладзімір Пятроў, які на двухтыднёвым конкурсе імя Глінкі ў Чалябінску пасяліў мяне ў сваёй маці), і муж, які і натхняў, і грошай на паездкі не шкадаваў.

**— Дзякуючы яму, дарэчы, вы сталі Волкавай. Змена прозвішча неяк паўплывала на ўнутраны стан? Можа, і сапраўды з'явілася гэткая "воўчая хватка"?**

— Я так хацела замуж, што калі мы прыйшлі ў

Я ёй ціхенька: "Гэта я". — "Прозвішча змяніла? Гэта ж крута! Ну, што такое Бондарава? Штосьці рамеснае, звязанае з вырабам бочак. А Волкава — гучыць. Адразу зразумела: дарогу ёй не пераходзь, бо загрызе".

**— І што, даводзілася кагосьці "загрызці"?**

— Ды не, я па натуры не баец — змагаюся толькі з сабой. Упэўнена, калі чалавек увесь час знаходзіцца ў стане барацьбы, з самага пачатку нацэлены на гэткае змаганне з усім і ўсімі, асабліва ў мастацтве, нічога добрага не атрымаецца. Калі адчуваеш сябе пакрыўджаным, лепш за справу не брацца: будзе штосьці не тое, не так. Можа, гены крыўды-помсты заразныя? І наадварот: калі з цябе сыходзяць праменні любові, дабрыні, калі палаеш творчасцю, энергіяй, дык усім гэтым таксама "заражаеш" астатніх — і набываеш не ворагаў, якіх трэба знішчыць-спапяліць, а паплечнікаў. Ну, а ўвогуле... Хочаш зрабіць добра — зрабі сам (пры ўмове, вядома, што сам у гэтым разбіраешся).

**— Што яшчэ на сёння вы павінны "зрабіць самастойна"? Акрамя новых партый, новых спектакляў...**

— Я дасягнула далёка не ўсяго, на што здольная: ніхто не ведае нас лепш, чым мы самі. Мяне не задавальняе, да прыкладу, тое, што я чалавек "апошняга моманту", жыву выключна "сёння і зараз". З аднаго боку, гэта добра, што я хуткая на пад'ём і гатова імгненна сесці ў самалёт і выратаваць спектакль хоць на краі свету. Але хацелася б больш доўгатэрміновага планавання — як у многіх іншых вядомых салістаў, калі планы, паездкі, запрашэнні распісаны на пяцігоддзе наперад. У свой час муж зрабіў мне сайт, а я там не магу нават біяграфію сваю давесці да ладу, неяк структураваць інфармацыю, унесці апошнія сведчанні, рэгулярна адпраўляць у агенцтвы апошнія запісы,

**"Расправіўшыся" з дзіцячымі школамі мастацтваў і сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі вуснамі дзеючых музыкантаў, што яшчэ і выкладаюць у іх, мы лагічна падабраліся да ВНУ. Змяняць сабе "К" не стала і зноў звярнулася да прафесіяналаў сцэны ў галіне музыкі, якія таксама навучаюць студэнтаў.**

Алег КЛІМАЎ

### Шанц для ўсіх

**Аляксандр САПЕГА,** бубнач гурта Apple Tea, старшы выкладчык кафедры духавой музыкі факультэта музычнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:

— Радуе новае пакаленне студэнтаў. Яны працаздольныя, зацікаўленыя ў той сваёй будучыні, якую плануюць звязаць з прафесіяй музыканта. Больш азартныя ў вучобе, чым тыя, хто ў мяне займаўся гадоў пяць таму. І настырныя ў атрыманні інфармацыі, што праўдамі-няпраўдамі з мяне выпампоўваюць, ды я і сам з імі ахвотна дзялюся нейкімі сакрэтамі, бачачы, што "таемнае" падае на добрую глебу. Прыемна выкладаць такім людзям, якія словам "кулёк" наш універсітэт не называюць, ва ўсялякім выпадку, пры мне. І я ганаруся тым, што... ну, добра, 99 % маіх гадаванцаў знаходзяць сябе ў музыцы. Прытым трапляюць да мяне не самыя суперадораныя — у самых дарога ляжыць у Акадэмію музыкі, або на нашу кафедру мастацтва эстрады — да майго "канкурэнта" па інструменце Аляксандра Старажука. Але ў цэлым якасцю выпускнікоў сярэдніх спецыяльных устаноў, што да нас паступаюць, я задаволены. Выдатна, што менавіта там іх сапраўды прыстойна "нацягваюць". Заўважу, што мае калегі з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Што ў ВНУ табе тваёй?


Аляксандр Сапега. / Фота аўтара


Сяргей Труханавіч.

## Вышэйшыя навучальныя ўстановы — вуснамі музыкантаў-педагогаў

рэгіянальных ССНУ ў даверных размовах неаднаразова казалі пра тое, што не рэдкасць, калі на некаторых іншых аддзяленнях педагогі строга прытрымліваюцца старой школы выкладання, не прымаюць і не разумеюць новых павеваў. Але мы, “грукачы”, заўсёды знаходзімся ў пошуку!

Я наогул вазьму на сябе смеласць “адказаць” за ўсю беларускую вышэйшую музычную адукацыю. Пры ўсіх тых папроках, часам справядлівых, што адрасуюцца дзіцячым школам мастацтваў і ССНУ, “вышка” марку трымае. Магчыма, асобныя напрамкі ў ёй і “праселі”, але, на мой погляд, вельмі асобныя, і ўсё гэта — сітуацыя часовая. Першыя месцы мы ў рэйтынгу сусветных універсітэтаў не займаем — грошы ў нашай адукацыі не тыя, каб ва ўсім быць сучасным і сярод перадавых, але за нашу альма-матар я скажу — гэта якасць і ўзровень. Як мне распавёў з нагоды маіх выпускнікоў адзін аўтарытэтны расійскі музычны дзеяч, спецыяліст у “барабаннай справе”, любы з іх мог бы стаць лаўрэатам любога адпаведнага міжнароднага конкурсу. І становяцца ж!

**Сяргей ТРУХАНОВІЧ,** гітарыст гуртоў “Палац” і “Крама”, выкладчык гітары кафедры мастацкай творчасці і прадзюсарства факультэта мастацтваў Інстытута сучасных ведаў імя Аляксандра Шырокава:

— На дзённае аддзяленне ў наш інстытут могуць паступаць людзі, якія наогул не маюць ніякай музычнай адукацыі — ні пачатковай, ні сярэдняй, якія не адрозніваюць ноту “до” ад ноты “рэ”. І такія, як ні дзіўна, ёсць, і іх не так ужо і мала, тых, што нейкім чынам ледзь было не прайшлі міма свайго, як яны лічаць, сапраўднага паклікання. У працэсе навучання яны робяць “прарыў” у ведах і пазней становяцца першакласнымі музыкантамі. Прыкладам таму служыць Віталь Ткачэнка, які працягнуў сваю музычную адукацыю ў Атланце, дзе на выдатна скончыў Atlanta Institute of Music and Media, а ў дадзены момант ужо з’яўляецца і выкладчыкам гэтай легендарнай навучальнай установы (пра яго “К” пісала ў №№ 5 і 9 за 2014 год).

Выкладчыцкі склад у нас проста шыкоўны, досыць успомніць Пятра Елфімава. А колькі яшчэ педагогаў, адначасова і артыстаў-практыкаў (“палявых хірургаў”, як я іх называю): Юрый Дзмітрыеў, Аляксей Зайцаў, Андрэй Маўрын... І ў дзяржустановах, і ў нас, наколькі я ведаю, хапае “тэарэтыкаў”. Але па спецпрадметах тут практычныя заняткі праходзяць вельмі прадуктыўна, тэорыя падмацоўваецца нагляднымі прыкладамі абавязкова.

Ці “мінус” тое, што ў інстытуце, натуральна, няма размеркавання? Магчыма. Таму што малады спецыяліст, падрыхтаваны дзяржаўнай ВНУ, не “платнік”, гарантавана будзе працаўладкаваны (тут ёсць тонкасці, але я кажу пра агульнае правіла). (Іншае пытанне, калі канкрэтным размеркаваннем чалавек можа быць незадаволены.) Таму ў параўнанні з калегамі з дзяржаўных “вышак” студэнты тут больш мэтанакіраваныя, жорсткія, учэпістыя, ім трэба адразу пачынаць плыць. Асабліва завочнікі больш адказныя і немінчане. Найбольш “прасунутых” дзяўчат і хлопцаў мы самі “ўладкоўваем” у калектывы, часцяком хтосьці тэлефануе нам і просіць даць добрага музыканта. Некаторыя ўжо граюць у вядучых гуртах і аркестрах Беларусі.

## Заплацілі — вучы

**Сяргей ТРУХАНОВІЧ:**

— З дзіцячых школ мастацтваў, сярэдніх спецыяльных устаноў прыходзяць да нас з рознай падрыхтоўкай. Але з вельмі ўжо жудаснай я не сустракаўся: усе нешта ведаюць і ўмеюць, ці хоць нешта, прынамсі. Але вось той “плюс”, пра які я гаварыў у адносінах да тых, хто зусім не разбіраецца ў музыцы, абарочваецца і “мінусам” — для выкладчыкаў. Таму што з імі даводзіцца займацца з азоў, што вядома, некалькі “напружвае” — не вельмі ж вабіць кагосьці цягнуць за вушы. Аднак — “уплочено”. І становіцца шкада ўласнага змарнаванага часу на такіх студэнтаў, калі яны пасля заканчэння інстытута ў музыцы не застаюцца менавіта з той прычыны, што да іх нарэшце дайшло — не іх гэта справа.

На жаль, і людзі таленавітыя сёння ў прафесію са страшнай сілай не імкнуцца: як я бачу, значная частка выпускнікоў інстытута, нягледзячы на тое, што яны аплачвалі сваю вучобу, потым ад музыкі па вялікім рахунку адыходзяць. Сустракаю некаторых у студыях гуказапісу, у крамах інструментаў, дзе яны працуюць дэманстратарамі, пытаюся: “А чаго не на сцэне?” “Ай...” — адказваюць і махаюць рукой. Калі шчыра, то цяперашнія студэнты наогул не тыя, што былі яшчэ сем гадоў таму, калі я прыйшоў выкладаць. Няма таго бляску ў вачах у цяперашніх. Ды і цікавейшыя раней хлопцы былі. Як той жа Андрэй Кацікаў, якога мне калісьці пашчасціла вучыць, — выпускнік знакамітага каледжа Бэрклі ў Бостане.

Фінансавае становішча выкладчыкаў і інстытута ў цэлым залежыць ад колькасці нашых студэнтаў. На жаль, апошнія гады два набор падае ў многіх навучальных установах. Я звязваю гэта ўсё ж з дэмаграфічнымі праблемамі, а не з тым, што стала менш ахвотных паступіць. Можа, таму і на характэрных асобаў дэфіцыт.

Хацелася б умацавання матэрыяльнай базы — па камп’ютарах, гукаўзмацняльнай апаратуры. А то давялося выкладчыкам самім абсталёўваць другі клас для заняткаў уласнымі комбікамі і правадамі. У нас няма добрай залы, у якой можна было б ладзіць канцэрты, конкурсы, фестывалі і іншае, а калі яны пад бокам, яшчэ і вельмі карысныя для студэнтаў як наглядны дапаможнік. Хоць, вядома ж, кіраўніцтва інстытута заўсёды ідзе насустрач пажаданням і стараецца дапамагаць, па меры магчымасці.

**Аляксандр САПЕГА:**

— У маёй працы турбуе нейкі геаграфічны пераскос, калі асобныя вобласці сваімі студэнтамі наогул не прадстаўлены, і такое паўтараецца, а я ж выкладаю тут добры тузін гадоў. Заўсёды ёсць моцныя выхадцы з Брэста і Магілёва, з Маладзечна. А з Гродна не едуць, з Гомеля — за рэдкім выключэннем, як і з полацкіх краёў. Выходзячы з гэтага, ці можна зрабіць выснову пра тое, як у тамтэйшых сярэдніх музычных установах рыхтуюць барабаншчыкаў? Хто ведае... Але і не могуць жа ўсе іх выпускнікі быць геніяльнымі і вучыцца толькі ў Акадэміі і ў Старажука?!.. Я ўзяў бы нават шырэйшы ахоп, кафедру наогул, якая, па ідэі, павінна была б рэгулярна і ў неабходнай колькасці папаўняцца навучэнцамі. А адкуль ёй папаўняцца, адкуль папаўняцца дзіцячым школам мастацтваў, ССНУ, калі ў дамах культуры ліквідуюцца духавыя аркестры, знікае пажыўная база для навучальных устаноў? Наш знакаміты саксафаніст Ігар Люты пачынаў з такога гуртка, а сёння за шчасце па святах пачуць на плошчы аматарскі аркестр духавой музыкі, а раней гэтыя калектывы гралі ў парках ледзь ці не кожныя выхадныя. Што, людзям цяпер яны не патрэбныя? Мяркуючы па тым, колькі народу збіраецца ў Мінску ля Ратушы на выступы джазавых або класічных музыкантаў, патрэбныя. А мы ўжо губляем цэлы пласт культуры...

І яшчэ адзін “крык душы”, спадарожны. Разумею, што бессэнсоўны... Ці ведаеце вы, які аклад сярэднестатыстычнага выкладчыка музычнай навучальнай установы?.. Дык вось, часам і “заідэйныя” людзі выдыхаюцца. Культуру мы, вядома, не страцім, але сякія-такія яе пласты потым трэба будзе доўга аднаўляць, і з прыцягненнем ужо зусім іншых фінансаў. У лепшым выпадку. У горшым — нешта давядзецца закансерваваць, як сёння некаторыя замкі...

І пара словаў пра матэрыяльнае забеспячэнне. Зайдзіце ў мой кабінет, паглядзіце на інструменты, на якіх займаюцца студэнты, і паспрабуйце самі адказаць на сваё пытанне: “Яны лаўрэатамі конкурсаў становяцца, вучачыся граць на іх?..” Так, на іх. А я ўсё з дому прынесці не магу... К

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ